

# ПУНКТЫ РОСТУ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**У панядзелак у Палацы Незалежнасці прайшлі дзве сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі — з губернатарам Краснаярскага краю і наследным прынцам Амана, на якіх ішла размова аб перспектывах узаемадзеяння**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
20 МАЯ АЎТОРАК № 95 (30483)

# НА КЛЕТАЧНЫМ УЗРОЎНІ

**Беларускія навукоўцы распрацоўваюць біямедыцынскія прадукты для лячэння цяжкіх хвароб**

Інстытут біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі займаецца распрацоўкай клетачных прадуктаў, якія прымяняюцца для лячэння раку, цукровага дыябету, алергіі і аўтаімунных паталогій, неўралагічных захворванняў, у прыватнасці такіх, як рассеяны склероз і бакавы аміятрафічны склероз. На лячэнне ў інстытут прыязджаюць не толькі з розных куткоў Беларусі, але і з Расіі і іншых краін.

СТАР. 8–9










Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ГАЛЕРЭЯ НАРОДНЫХ МСЦІЎЦАЎ 7



ЧАС ЗДЗЕЙСНІЦЬ МАРЫ 10



НА СЛЫХУ

# ШКОЛЬНАЯ ФОРМА, ПРАВЫ КІРОЎЦЫ І БАЦЬКІ-ПЕДАГОГІ

**Што зменіцца ў сістэме адукацыі краіны з 1 верасня**

З новага навучальнага года набудуць сілу змяненні ў Кодэксе аб адукацыі. Яны закрануць вучняў і іх бацькоў, выпускнікоў ВНУ і каледжаў, самі навучальныя ўстановы і суб'екты гаспадарання, якія ажыццяўляюць адукацыйную дзейнасць на камерцыйнай аснове.



Аб асноўных мэтах і прыярытэтах пры распрацоўцы змяненняў у Кодэкс аб адукацыі, аб тым, у сувязі з чым спатрэбілася ўносіць дапаўненні, мы папрасілі расказаць **члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы Сяргея КЛІШЭВІЧА.**

СТАР. 5

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25095>

# «ПАКАЗЧЫКІ НЯДРЭННЫЯ, АЛЕ ПАТЭНЦЫЯЛ ЗНАЧНА БОЛЬШЫ»

## Дзе пункты росту супрацоўніцтва Беларусі і Краснаярскага краю

Цэнтр Расіі і цэнтр Еўропы — у Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Краснаярскага краю Міхаілам Кацюковым. Гэта яго першы візіт у Беларусь, таму абмеркаваць ёсць што, паколькі наша краіна можа шмат чаго прапанаваць дадзенаму расійскаму рэгіёну. Ёсць і ўзаемны інтарэс: Краснаярскі край — скарбніца рэсурсаў, напоўненая нікелем, меддзю, вугалем, золатам і іншымі карыснымі выкапнямі.



Фота БелТА.

### МЫ ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ ПАДСТАВІЦЬ ПЛЯЧО

Вітаючы гасцей, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Беларусь і Краснаярскі край нядрэнна супрацоўнічаюць. Аб гэтым сведчыць рост тавараабароту, які дасягае прыкладна 200 мільёнаў долараў. Пік тавараабароту паміж Беларуссю і Краснаярскім краем быў дасягнуты ў 2022 годзе і склаў амаль 234 мільёны долараў, у 2023-м ён знізіўся да 207 мільёнаў. А ў 2024-м узаемны гандаль зноў вырас і дасягнуў 221 мільёна долараў.

**«Гэты паказчык мы можам значна павялічыць у сувязі з тым патэнцыялам, якім валодае вобласць і наша краіна, — сказаў Прэзідэнт. — Кірункі супрацоўніцтва, я ўпэўнены, вы добра ведаеце. Я проста нагадаю, што мы супрацоўнічалі і будзем супрацоўнічаць па пастаўках нашай тэхнікі, абсталявання, найперш для гарнаруднай прамысловасці. Такой тэхнікі, у тым ліку БЕЛАЗаў, у нас дастаткова. І з вамі, і з іншымі абласцямі Расійскай Федэрацыі, дзе гэта магчыма, мы гатовы і будзем супрацоўнічаць».**

Па словах кіраўніка дзяржавы, беларускі бок гатовы пастаўляць іншую грузавую тэхніку, прадукцыю «АМКАДОРа», МАЗа, якая добра вядома ў Краснаярскім краі. Гэтыя і іншыя буйныя прадпрыемствы нашай краіны госці наведаюць падчас свайго візіту, праграма якога досыць насычаная.

«Асобая тэма апошнім часам у Беларусі і Расіі — гэта замена ліфтавага абсталявання. Тут нікуды не падзенешся. Тыя ліфты, якія калісьці ўстанаўлівалі ў савецкія часы, ужо свой тэрмін адслужылі. Мы шмат пастаўляем ліфтаў па ўсім былым Савецкім Саюзе, і найперш у Расійскую Федэрацыю. Ведаю, што патрэба такая ёсць і ў вашай вобласці. Можаце на нас разлічваць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на супрацоўніцтва ў галіне аўтатранспартных перавозак. Па яго словах, беларускія прадпрыемствы гатовы пастаўляць сваю прадукцыю на экспарт. Прычым гаворка ідзе і аб тэхніцы на газаматорным паліве, не толькі на звычайным. Кіраўнік дзяржавы заявіў аб гатоўнасці беларускіх прадпрыемстваў выпрацоўваць новыя формы ўзаемаразлікаў, у тым ліку пастаўкі па лізінгу.

**«Супрацоўніцтва ў сферы аграпрамысловага комплексу і пастаўкі сельскагаспадарчай тэхнікі — вельмі перспектыўная, наша беларуская тэма. Калі вам будзе патрэбна, мы заўсёды гатовы падставіць плячо вашай вобласці. Мы таксама гатовы супрацоўнічаць з вамі ў галіне будаўніцтва. Нашы магчымасці вы добра ведаеце. Таму можаце на нас разлічваць, — запэўніў Прэзідэнт. — Словам, вы і вашы калегі добра ведаеце магчымасці Беларусі. Калі мы недзе можам падставіць вам плячо і супрацоўнічаць разам, на перспектыву, ведайце — мы да гэтага гатовы».**

### УЗАЕМАДЗЕЯННЕ З БЕЛАРУСКІМІ ПАРТНЁРАМІ МАЕ ДЛЯ НАС СТРАТЭГІЧНЫ ХАРАКТАР



У сваю чаргу Міхаіл Кацюкоў прызнаўся, што вельмі рад сустрэцца з беларускім лідарам у Мінску ў год 80-годдзя Вялікай Перамогі. «Краснаярцы з першых дзён вайны сустракалі ворага ў Брэсцкай крэпасці. І гналі яго да Берліна. Наш зямляк Ілья Пятровіч Кузняцоў першы, хто прыняў бой каля паўночных варот Брэсцкай крэпасці, затым змагаўся ў цытадэлі, атрымаў шмат раненняў. Але, напэўна, цуд, сібірскае здароўе і характар дазволілі яму выбрацца з захопленай крэпасці і ён дайшоў да Берліна. Усяго 21 жыхар Краснаярскага краю за вызваленне Беларусі быў прадстаўлены да звання «Герой Савецкага Саюза». І мы ганарымся нашымі землякамі, — зрабіў невялікі гістарычны экскурс губернатар. — Упэўнены, што гэта наша агульная гістарычная памяць і мы павінны яе захоўваць і перадаваць моладзі».

Міхаіл Кацюкоў заўважыў, што краснаярскія і беларускія маладыя людзі актыўна ўзаемадзейнічаюць у рамках разнастай-

**У тэму**

# ТРЫВАЛАЯ АСНОВА АДНОСІНАЎ

## Беларусь гатова працягваць канструктыўнае супрацоўніцтва па ўсіх кірунках

Пасля прадметнай размовы ў Палацы Незалежнасці губернатар Краснаярскага краю накіраваўся ва ўрад, дзе адбылася сустрэча з намеснікам Прэм'ер-міністра Віктарам КАРАНКЕВІЧАМ.

Віктар Каранкевіч запэўніў Міхаіла Кацюкова ў гатоўнасці Беларусі працягваць канструктыўнае супрацоўніцтва па ўсіх кірунках узаемадзеяння, якія ўяўляюць цікавасць для Краснаярскага краю.

«У першую чаргу хацелася б абазначыць перспектывы ў сферы прамысловасці і звярнуць увагу на машынабудаванне. У святле запланаваных і маштабных інвестыцыйных праектаў у горназдабыўной і апрацоўчай галінах, якія рэалізоўваюцца на тэрыторыі Краснаярскага краю, неабходнасці замены імпартнай тэхнікі ёсць магчымасць нарасціць пастаўку велікагрузных самазвалаў, а таксама новай тэхнікі, якая раней не закуплялася», — заявіў віцэ-прэм'ер.

«Мы пачалі ўжо сумесную работу па горна-шахтавым і буравым абсталяванні, тэхніцы для падземных работ, — адзначыў ён. — Зацікаўлены пастаўляць і прадукцыю беларускага машынабудавання — пасажырскую, грузавую, камунальную, спецыяльную, сельскагаспадарчую тэхніку. Для гэтага прапануем таксама механізмы льготнага фінансавага суправаджэння паставак, якія ўжо былі прэзентаваны краснаярскаму боку».

Пры гэтым, па словах Віктара Каранкевіча, Беларусь гатова стварыць сучасны цэнтр тэхнічнай падтрымкі тэхнікі БЕЛАЗ, а таксама разгледзець перспектыву стварэння мультыбрэндавага гандлёва-сэрвіснага цэнтра ў Краснаярскім краі.

Таксама наша краіна зацікаўлена ў павелічэнні паставак харчовых тавараў у Расію. Віктар Каранкевіч адзначыў, што беларускі бок гатовы актывізаваць свой удзел у праграмах развіцця сельскай гаспадаркі, а таксама ўзаемадзеянне ў сферы аграпрамысловага комплексу з Краснаярскім краем — абмену вопытам, тэхналогіямі і спецыялістамі. «Прапаную разгледзець наш вопыт у тэхналогіях жывёлагадоўлі і раслінаводства, вытворчасці і выкарыстанні беларускіх амінакіслот, камбікармоў, прэміксаў, вітамінна-мінеральных комплексаў і ветэрынарных прэпаратаў», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Акрамя таго, Беларусь зацікаўлена ў павелічэнні паставак беларускіх харчовых

ных праектаў. «Яны дакладна павінны ведаць, што ў нас агульнае гераічнае мінулае, шматгадовая даўняя дружба, цесныя культурныя, гуманітарныя сувязі. Упэўнены, што гэтыя кірункі мы можам развіваць разам», — сказаў ён.

Губернатар падкрэсліў: сёння Краснаярскі край — адзін з найбольш эканамічна развітых рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. «Узаемадзеянне з беларускімі партнёрамі мае для нас стратэгічны характар. Толькі за мінулы год аб'ём тавараабароту павялічыўся прыкладна на 7 %. А за два месяцы гэтага года — ужо на 14 %, у параўнанні з першымі двума месяцамі мінулага года. Таму лічба больш за 200 мільёнаў долараў дакладна не з'яўляецца мяжой. Гэта толькі чарговы рубеж, які мы можам істотна павялічыць», — канстатаваў Міхаіл Кацюкоў.

У размове з журналістамі губернатар адзначыў, што краснаярскіх і беларускіх вытворцаў звязваюць даўнія гады дружбы і многія сумесныя праекты. «У нас практычна 60 % кар'ерных самазвалаў — беларускія, 40 % трактароў у палях таксама беларусія. І мы бачым, як сёння развіваюцца беларускія прадпрыемствы, ствараюцца новыя віды прадукцыі. У нас ёсць цікавасць да пашырэння такога віду супрацоўніцтва, — сказаў ён. — Нашы прадпрыемствы паміж сабой праводзяць перагаворы аб стварэнні сумесных вытворчасцяў на тэрыторыі Краснаярскага краю, дзе можна было б забяспечыць спачатку зборку, а затым лакалізацыю асобных камплектуючых».

Па словах Міхаіла Кацюкова, важна ствараць і сэрвісныя цэнтры, дзе можна будзе абслугоўваць і рамантаваць тэхніку. Стварэнне такога цэнтра ён назваў важным і перспектыўным праектам на будучыню. «Прынцыпова важна, і мы аб тым дамовіліся, што гэта будзе мультыбрэндавая пляцоўка, дзе будуць прадстаўлены розныя беларускія вытворцы і работа будзе весціся па шырокім спектры спецыяльных машын, абсталявання, але на адной пляцоўцы ў Краснаярскім краі. Мы такую ініцыятыву ўсяляк падтрымліваем і, упэўнены, знойдзем магчымасць яе рэалізаваць у найбліжэйшы час», — рэзюмаваў кіраўнік рэгіёна.

У Краснаярску актыўна будуецца метро. Гэтаму праекту ўжо шмат гадоў, пачынаўся ён яшчэ ў савецкія часы, затым некалькі разоў быў замарожаны і нарэшце адноўлены. За апошні год зроблена больш, чым за папярэднія сорак. Міхаіл Кацюкоў не выключыў прыцягнення да гэтага праекта і беларускіх спецыялістаў.

«Краснаярскі край знаходзіцца ў самым цэнтры Расіі, з Краснаярска можна ажыццяўляць пастаўкі ў суседнія рэгіёны. Дамовіліся прадметна, у рамках нашай работы ў Беларусі зафіксаваць канкрэтныя прапановы», — паведаміў у гутарцы з журналістамі губернатар. Ён таксама звярнуў увагу, што важна арганізаваць турыстычныя абмены: «Мінск — найпрыгажэйшы горад. Хачу, каб яго ўбачылі краснаярцы. І нам ёсць што паказаць беларусам на берагах Енісея. Для гэтага важна запусціць авіяцыйны рэйс, што мы таксама абмяркоўвалі на сустрэчы з Прэзідэнтам».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

тавараў, якія добра сябе зарэкамендавалі ў Расійскай Федэрацыі дзякуючы высокай якасці. «Гатовы абмеркаваць перспектывы павелічэння паставак у Беларусь вашай сельскагаспадарчай сыравіны. У ходзе сённяшняй сустрэчы гатовы абмеркаваць гэтыя і іншыя кірункі супрацоўніцтва, якія ўяўляюць узаемную зацікаўленасць і ствараюць трывалую аснову для развіцця адносін паміж Беларуссю і Краснаярскім краем», — звярнуў увагу намеснік Прэм'ер-міністра.

З улікам высокіх аб'ёмаў уводу жылля і рэалізацыі праектаў комплекснага развіцця тэрыторый, прамысловага будаўніцтва віцэ-прэм'ер адзначыў магчымасць удзелу беларускіх праектных арганізацый, якія досыць актыўна і паспяхова працуюць у розных рэгіёнах Расіі.

**Па матэрыялах БелТА.**

# «МЫ СТАЛІ НЕ ПРОСТА ПАРТНЁРАМІ, А ЎЖО СЯБРАМІ»

## Узаемадзеянне з Аманам набірае абароты

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з наследным прынцам — міністрам культуры, моладзі і спорту Султаната Аман Зеязінам бен Хайтамам Аль Саідам. Менавіта яму даручана каардынацыя супрацоўніцтва з Беларуссю. Дарэчы, нашу краіну аманскі наследнік наведвае ўпершыню. На сустрэчы таксама прысутнічаў прэзідэнт Аманскага інвестыцыйнага агенцтва Абдэльсалам Махамед аль-Муршыдзі.



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка з рабочым візітам наведваў Аман у снежні 2024 года. Той візіт даў старт супрацоўніцтву дзвюх краін. Тады прадстаўнікі абодвух урадаў падпісалі дакументы аб супрацоўніцтве і адпрацавалі дарожныя карты па галінах.

**«Мне здаецца, што ў выніку майго візіту ў вашу цудоўную краіну ў свой час мы сталі не проста партнёрамі, а ўжо сябрамі. Мы абменьваліся шматлікімі прапановамі, па напрамку якіх можам выбудоўваць сваё супрацоўніцтва. Нам вельмі цікавая ваша краіна. Не буду ўтойваць, як некаторая альтэрнатыва ў тым рэгіёне для прасоўвання нашых інтарэсаў», — адзначыў ён.**

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў аснове ляжыць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Беларусі цікавая партовая інфраструктура Амана, каб сумесна развіваць гандаль і з іншымі краінамі рэгіёна, у тым ліку і з краінамі Афрыканскага кантынента. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пакуль бакі не прасунуліся ў супрацоўніцтве па тых ці іншых кірунках, як планавалася. Але, канстатаваў ён, дакладна пераканаліся ў тым, што могуць супрацоўнічаць па акрэсленых праектах.

**«У Беларусі ёсць шмат таго, што сёння цікавіць аманскі бок. Вы нам вельмі цікавыя па многіх кірунках. Гэта і адпачынак нашых людзей, сельская гаспадарка, пастаўка прадукцыі. І, самае галоўнае, вашы парты, праз якія мы можам працаваць у рэгіёне», — сказаў ён.**



Беларускі лідар падзяліўся, што з вялікай шчырай цеплынёй успамінае сваю сустрэчу ў Маскаце з Султанам Амана, якога ён ахарактарызаваў як вельмі прыстойнага і добрага чалавека. Прэзідэнт запэўніў, што яго з вялікім задавальненнем гатовыя прыняць у Беларусі. «Перадайце яму самыя добрыя, цёплыя пажаданні і скажыце яму, што я чакаю яго ў Мінску», — папрасіў ён.

Зеязін бен Хайтам Аль Саід падзякаваў за гасціннасць і цёплы прыём, перадаў прывітанні ад свайго бацькі — Султана Амана.

**«З моманту вашага візіту мы сур'ёзна рушылі наперад у нашых адносінах. Пачалі са сферы турызму, гасціннасці. Мы вельмі рады, што атрымалася адкрыць прамы рэйс з Мінска ў наш паўднёвы горад Салала. І ўжо шмат беларусаў змаглі пабываць у Амане. Таксама мы пачалі шэраг іншых узаемавыгадных праектаў. Я вельмі рад, што тыя праекты, якія мы намецілі, сапраўды зробяць сур'ёзны ўнёсак у павелічэнне тавараабароту і інвестыцыйнае супрацоўніцтва паміж намі», — адзначыў наследны прынц.**

Пасля сустрэчы ў Палацы Незалежнасці ў Міністэрстве замежных спраў было падпісана міжурадавае пагадненне аб стварэнні сумеснага камітэта па супрацоўніцтве і інвестыцыях. Подпісы пад дакументам паставілі міністр замежных спраў Максім Рыжанкоў і прэзідэнт Аманскага інвестыцыйнага агенцтва Абдэльсалам Махамед аль-Муршыдзі. Яны і сталі сустаршынямі сумеснага камітэта.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Дарэчы**

# АД ПЕРСІДСКАГА ЗАЛІВА ДА АФРЫКІ

## Расце ўклад далёкай дугі ў развіццё міжнароднага гандлю Беларусі

Аб гэтым у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» заявіў **міністр замежных спраў Максім РЫЖАНКОЎ.**

«Калі мы гаворым пра Афрыку, то ўклад далёкай дугі кратна расце. Я не глядзеў бы тут з месяца ў месяц. Трэба глядзець гады. Калі мы паглядзім у дынаміцы, то ўбачым, што ўсё больш і больш гэтыя рэгіёны займаюць у нашым гандлі, палітыцы, нашых міжнародных адносінах», — падкрэсліў Максім Рыжанкоў. Ён адзначыў, што ў ліку перспектыўных партнёраў Беларусі на Афрыканскім кантыненце Эфіопія, Гана, Нігерыя і шэраг іншых краін.

Актыўнае супрацоўніцтва развіваецца і з дзяржавамі Персідскага заліва. Напрыклад, з ААЭ і Аманам. І гэта не проста гандаль, а перш за ўсё інвестыцыйнае ўзаемадзеянне, якое з'яўляецца асновай для развіцця адносін.

«Інвестыцыі прадугледжваюць больш доўгі працэс супрацоўніцтва, чым проста гандаль таварамі. Сёння гандлюем — заўтра не гандлюем. А інвестыцыі абавязваюць да працягу ў даволі доўгім перыядзе», — растлумачыў Максім Рыжанкоў.

МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# ПРЫЯРЫТЭТ — УМАЦАВАННЕ АДЗІНСТВА І ЎЗАЕМНАЙ ПАДТРЫМКІ

## Парламенцкая дэлегацыя Беларусі прыняла ўдзел у выязным пасяджэнні Савета Парламенцкай асамблеі АДКБ у Бішкеку

На мерапрыемстве асноўная ўвага — пытанням рэалізацыі рашэнняў лістападаўскай (2024 года) сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ і мерам, якія прымаюцца па процідзеянні выклікам і пагрозам калектыўнай бяспецы, а таксама вынікам работы па фарміраванні праекта Праграмы дзейнасці Парламенцкай асамблеі АДКБ па зближэнні і гарманізацыі нацыянальнага заканадаўства дзяржаў — членаў АДКБ на 2026—2030 гады.

### «ПАКУЛЬ МЫ РАЗАМ — МЫ НЯЗЛОМНЫЯ»

Напярэдадні пасяджэння **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА,** які ўзначаліў парламенцкую дэлегацыю, узяў удзел у цырымоніі ўскладання кіраўнікамі парламенцкіх дэлегацый дзяржаў — членаў АДКБ кветак да Вечнага агню каля манумента Перамогі ў сталіцы Кыргызстана. Тэма перамогі над фашызмам знайшла працяг на пасяджэнні Савета Парламенцкай асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Падчас свайго выступлення Ігар Сергеенка сказаў: «Нядаўна мы шырока і ўрачыста адсвяткавалі найважнейшую падзею ў нашай гісторыі — 80-ю гадавіну Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта святы для ўсіх нас дзень. Аддаць даніну гістарычнаму подзвігу шматнацыянальнага савецкага народа — наш абавязак. Вялікая перамога даказала бясспрэчную ісціну: пакуль мы разам — мы нязломныя. Сімвалічна, што ў Маскве 9 мая на Краснай плошчы ваенны парад прымалі прэзідэнты нашых краін, а ў парадным страі плячо ў плячо прайшлі вайскоўцы Узброеных Сіл нашых дзяржаў».

Спікер заўважыў, што і ў Мінску ў гэты дзень таксама адбыўся ваенны парад, у якім удзельнічалі прадстаўнікі Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана. «Удзел парадных разлікаў Узброеных Сіл дзяржаў — членаў АДКБ у Парадзе Перамогі сімвалізуе адзінства арганізацыі», — адзначыў ён.

**— Мы былі разам тады. Мы разам сёння. І павінны зрабіць усё, каб не дапусціць новай сусветнай бойні, якая можа быць канцом гісторыі, падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка ў сваім выступленні перад удзельнікамі парада ў Мінску.**

«Сёння мы ўсклалі вянкі да Вечнага агню на кыргызскай зямлі і чарговы раз адчулі пачуццё бязмежнай павагі да сапраўдных сыноў сваёй Айчыны, якія праявілі найвялікшую сілу духу, гераізм і стойкасць і здолелі неверагоднымі намаганнямі пераламаць ход сусветнай гісторыі».



Фота ТГ-канала Палаты прадстаўнікоў.

### НЕБЫВАЛЫ РОСТ НАПРУЖАНАСЦІ

Гаворачы аб сучасных выкліках і пагрозах, Старшыня Палаты прадстаўнікоў заявіў, што АДКБ павінна адаптавацца да існуючых умоў развіцця міжнароднай абстаноўкі.

«Мы сталі сведкамі і ўдзельнікамі новага жорсткага перадзелу свету. Трэба прызнаць, што крызіс міжнародных адносін і трансфармацыя сусветнага геапалітычнага ландшафту суправаджаюцца небывалым нарастаннем напружанасці, далейшай дэградацыяй існуючай сістэмы бяспекі, — сказаў Ігар Сергеенка. — У гэтых умовах АДКБ павінна адаптавацца да сучасных умоў развіцця міжнароднага становішча. Толькі так мы зможам забяспечыць своечасовае і максімальна эфектыўнае рэагаванне на зменлівыя выклікі і пагрозы бяспекі».

Ён падкрэсліў, што сёння павінна быць дакладнае бачанне далейшых мэт і задач дзейнасці арганізацыі. Асобна Ігар Сергеенка адзначыў ролю яе парламенцкага складніка.

Таксама ён звярнуў увагу ўдзельнікаў пасяджэння на актуальнасць актывізацыі дыялогу аб новай Еўразійскай архітэктуры бяспекі. «З гэтай мэтай у рамках праведзеных у Мінску ў 2023 і 2024 гадах дзвюх міжнародных канферэнцый Беларусь запусціла працэс абмеркавання дадзенай ініцыятывы. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выступіў за стварэнне агульнай прасторы даверу і супрацоўніцтва, за аб'яднанне краін не супраць каго-небудзь, а ў імя агульнай мэты, каб пазбегнуць фатальнага цывілізацыйнага разлому», — сказаў Ігар Сергеенка.

### ЗАКАНАДАЎЧЫ АСПЕКТ

На думку спікера, парламентарыі павінны максімальна эфектыўна забяспечыць рэалізацыю задач па ўмацаванні бяспекі, якія вырашаюцца АДКБ. У прыватнасці ён заначыў: заканадаўчае забеспячэнне рашэнняў, што прымаюцца, — гэта найважнейшы кірунак работы Асамблеі. І менавіта парламентарыі могуць — і павінны — максімальна эфектыўна забяспечыць рэалізацыю задач па ўмацаванні бяспекі, якія вырашаюцца АДКБ.

Адзначыў Ігар Сергеенка і тое, што ў парадак дня асобным пунктам уключана абмеркаванне Праграмы дзейнасці Асамблеі па збліжэнні і гарманізацыі нацыянальнага заканадаўства дзяржаў — членаў АДКБ на 2026—2030 гады.

**«На наш погляд, у ёй, праграме, знайшоў адлюстраванне ўвесь спектр праблем, звязаных з забеспячэннем нацыянальнай бяспекі, — барацьба з тэрарызмам, пытанні ваеннай і інфармацыйнай бяспекі, электаральнага суверэнітэту, захавання гістарычнай памяці, міратворчая дзейнасць, барацьба з нелегальнай міграцыяй», — падкрэсліў ён.**

Таксама Старшыня Палаты прадстаўнікоў падзякаваў кіраўнікам нацыянальных парламентаў за фарміраванне групы міжнароднага назірання ад Парламенцкай асамблеі АДКБ для маніторынгу выбараў Прэзідэнта Беларусі.

**Паводле БелТА.**

**По заканчэнні пасяджэння Ігар Сергеенка ўзяў удзел у сустрэчы Прэзідэнта Кыргызскай Рэспублікі Садыра Жапарава з кіраўнікамі парламенцкіх дэлегацый дзяржаў — членаў АДКБ. Падчас мерапрыемства размова ішла аб рэгіянальнай бяспецы, умацаванні міжпарламенцкага ўзаемадзеяння і далейшым развіцці супрацоўніцтва ў рамках АДКБ.**

ПАДЗЕЯ

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАШТОЎНАСЦІ, ДУХОЎНАСЦЬ, МІРАЛЮБНАСЦЬ

## Ігар СЕРГЯЕНКА аб тым, што аб'ядноўвае Беларусь і Святы Прастол

Па даручэнні Прэзідэнта дэлегацыя на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Ігарам СЕРГЯЕНКАМ узяла ўдзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, звязаных з інтранізацыяй Папы Рымскага Льва XIV у Ватыкане.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў падчас урачыстай цырымоніі інтранізацыі новага кіраўніка Каталіцкай царквы сустрэўся з Папам Рымскім Львом XIV. Ігар Сергеенка перадаў Папу Рымскаму Льву XIV віншаванне ад Прэзідэнта, а таксама падарунак ад кіраўніка беларускай дзяржавы — абраз Божай Маці «Жыровіцкая».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў сардэчна павіншаваў Льва XIV з пачаткам пантыфікату. Ён выказаў упэўненасць, што пастырскае служэнне Льва XIV з'яўляецца дабром для чалавецтва на зямлі. Як падкрэсліў Ігар Сергеенка, у наш няпросты і непрадказальны час спадзяванні народаў на мір і сацыяльную справядлівасць толькі ўзмацняюцца, і хрысціянскія каштоўнасці, духоўнасць, міралюбнасць — тое, што цяпер аб'ядноўвае Беларусь і Святы Прастол. Таму нам ёсць над чым разам працаваць. Звяртаючыся да пантыфіка, Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што Льва XIV будуць вельмі рады бачыць на гасціннай беларускай зямлі.

**Паводле БелТА.**

ДУХОЎНАСЦЬ

# БЕЛАРУСЬ — КРАІНА МІРУ І ЗГОДЫ

## У Мінску ўрачыста адкрылася першая і адзіная ў краіне Армянская апостальская царква

Для асвячэння храма ў нашу краіну прыбыў Вярхоўны Патрыярх і Каталікос усіх армян ГАРЭГІН ДРУГІ.

**Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК** нагадаў, што ў нас зарэгістравана 25 канфесій і рэлігійных аб'яднанняў і кожны чалавек мае права на выбар веравызнання і пошук сваёй дарогі ў храм: «Цяпер такая магчымасць дадзена і армянам, якія пражываюць у нашай краіне. На сёння іх больш за дзевяць з паловай тысяч. Гэта шостая па колькасці нацыянальнасць Беларусі».

На адкрыцці Армянскай апостальскай царквы прысутнічалі прадстаўнікі вядучых рэлігійных канфесій Беларусі. **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ВЕНІЯМІН** адзначыў, што ўзвядзенне ў беларускай сталіцы армянскай апостальскай царквы — сведчанне добрых адносін паміж народамі, а таксама адкрытасці нашай краіны, яе гатоўнасці аказваць падтрымку і ствараць умовы, каб прадстаўнікі розных канфесій маглі вызнаваць сваю веру.

«Мы як прадстаўнікі Рымска-каталіцкай царквы радуемся за нашых братоў армян, за народ, які адным з першых прыняў хрысціянства, — падзяліўся **ксёндз Франц РУДЗЬ**. — Гэта вельмі важная падзея гаворыць пра тое, што беларуская зямля адкрыта для кожнага чалавека».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

АКТУАЛЬНА

# ПАСТУПАЛЬНЫ ПРАЦЭС

## Усе неабходныя ўмовы для правядзення ЦЭ і ЦТ створаны

**Ва ўрадзе пад старшынствам намесніка Прэм'ер-міністра Уладзіміра КАРАНІКА прайшло пасяджэнне дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных выпрабаванняў ва ўстановах адукацыі ў 2025 годзе.**

— Штогод кіраўнік дзяржавы ўскладае на дзяржкамісію важную задачу па кантролі за выкананнем заканадаўства пры падрыхтоўцы да правядзення ўступнай кампаніі, накіраваную на абарону правоў і законных інтарэсаў грамадзян, — нагадаў профільны віцэ-прэм'ер.

Ён адзначыў, што на дадзены момант усе рабочыя органы дзяржкамісіі створаны, камісіі сфарміраваны і за членамі камісіі, за выключэннем старшыні абласной камісіі, ужо замацаваны канкрэтныя ўстановы адукацыі.

— Ваша першачарговая задача — арганізаваць аператыўны і бягучы кантроль за ходам уступной кампаніі на ўсіх яе этапах пры правядзенні цэнтралізаванага экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання. Гэта работа пачынаецца ўжо на наступным тыдні, — акцэнтаваў увагу Уладзімір Каранік.

Віцэ-прэм'ер нагадаў, што прыём і залічэнне абітурыентаў у рамках мэтавай падрыхтоўкі пачынаюцца з 27 чэрвеня, залічэнне абітурыентаў у асноўны набор устаноў вышэйшай адукацыі — з 12 ліпеня, ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі — з 18 ліпеня.

Уладзімір Каранік таксама акцэнтаваў увагу членаў камісіі на некаторых аспектах.

Па-першае, гэта дзейсны кантроль за правядзеннем і цэнтралізаванага экзамену, і цэнтралізаванага тэсціравання. Ён падкрэсліў, што гэта датычыцца дастаўкі, захоўвання, забеспячэння сакрэтнасці тэставых матэрыялаў, а таксама рэжыму пропуску і ідэнтыфікацыі асобы ўдзельнікаў.

— Асноўная задача камісіі — забяспечыць роўныя ўмовы ўсім нашым маладым людзям для дэманстрацыі свайго ўзроўню падрыхтоўкі і ведаў, — падкрэсліў ён.

Як і летась, цэнтралізаваны экзамен і цэнтралізаванае тэсціраванне будуць праходзіць у адзіныя тэрміны для ўсіх выпускнікоў. Цэнтралізаваны экзамен пройдзе ў 144 пунктах, а цэнтралізаванае тэсціраванне — у 40 пунктах у асноўныя дні і ў 6 пунктах у дадатковыя дні.

— Задача — забяспечыць максімальна камфортныя і бяспечныя ўмовы ва ўсіх названых пунктах. Як мяне ўжо праінфармавалі, усе неабходныя ўмовы для правядзення цэнтралізаванага экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання створаны. Гэта неаднаразова правяралася камісіямі. Заўвагі, якія былі выяўлены па выніках рэпетыцыйнага тэсціравання, своечасова ліквідаваны, — дадаў профільны віцэ-прэм'ер.

Тым не менш Уладзімір Каранік лічыць неабходным правесці дадатковы комплекс мерапрыемстваў па інфармаванні грамадскасці праз сродкі масавай інфармацыі па пытаннях арганізацыі цэнтралізаваных зон і цэнтралізаванага тэсціравання, асабліва аб пераліку забароненых дзеянняў. Гэта работа замацаваная за Мінадукацыяй сумесна з Мінінфармам.

Варта сказаць, што падыходы да правядзення ўступных выпрабаванняў не памяняліся. Наваўвядзеннем стала толькі тое, што цяпер электроннымі сродкамі ўдзельнікам цэнтралізаванага тэсціравання забаронена карыстацца не толькі непасрэдна ў месцы правядзення тэсціравання, але і фактычна ва ўсіх памяшканнях установы, дзе яно праводзіцца.

— Мы павінны забяспечыць праверку ведаў, а не тэхнічнай аснашчанасці нашых абітурыентаў. Важна, каб не было ніякіх эксцэсаў, звязаных з тым, што хтосьці забыўся зняць «разумны» гадзіннік, хтосьці забыўся выкласці дадатковы тэлефон. Трэба наладзіць інфармацыйную работу, каб усе былі дапушчаны да экзаменацыйных мерапрыемстваў і каб мы ніколі ў працэсе ЦЭ і ЦТ не выдалялі з аўдыторый за парушэнне дзеючых правіл, — рэзюмаваў Уладзімір Каранік.

# ШКОЛЬНАЯ ФОРМА, ПРАВЫ КІРОЎЦЫ І БАЦЬКІ-ПЕДАГОГІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дэпутат адзначыў, што прынцыпова новых нормы не ўводзяцца. Па сутнасці, гэта дашліфоўка кодэкса, якая носіць тэхнічны, практычны і аператыўны характар. Заканадаўцам і Міністэрствам адукацыі ўлічвалася ў першую чаргу правапрымяняльная практыка. У цэлым змяненні накіраваны на ўдасканаленне дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі, павышэнне якасці адукацыі, далейшае ўмацаванне прэстыжу беларускай сістэмы адукацыі.

### БІЗНЕС-АДУКАЦЫЯ

— У кодэкс былі ўключаны нормы, накіраваныя на ўдасканаленне сістэмы бізнес-адукацыі, — расказвае Сяргей Клішэвіч. — Цяпер Міністэрства эканомікі па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі зможа прадастаўляць статус бізнес-школ установам вышэйшай адукацыі (раней такі статус маглі атрымліваць толькі камерцыйныя арганізацыі). Норма датычыцца ўстаноў вышэйшай і дадатковай адукацыі дарослых і іх структурных падраздзяленняў у тым выпадку, калі яны рэалізоўваюць праграмы, накіраваныя на фарміраванне ведаў і навыкаў, неабходных для кіравання ў камерцыйных арганізацыях. Гэта і ёсць ключавы крытэрый аднясення да катэгорыі бізнес-школ.

### ШКОЛЫ, ШКОЛЬНІКІ І ІХ БАЦЬКІ

— Па-першае, пашыраюцца магчымасці арганізацыі бясплатнага падвозу дзяцей. Напрыклад, раней існавалі невялікія фармальныя праблемы, калі, скажам, падвоз не мог ажыццяўляцца ў межах аднаго населенага пункта. Цяпер праблема аграгарадкоў з вялікімі адлегласцямі, у тым ліку да ўстановы адукацыі, будзе вырашана. Таксама падвоз дзяцей можа быць арганізаваны ў шосты школьны дзень, прычым не толькі ў школу, але і, напрыклад, на экскурсіі і іншыя культмасавыя мерапрыемствы, — заўважыў суразмоўца.

Таксама ён звярнуў увагу на тое, што з гэтага часу на заканадаўчым узроўні выключаецца магчымасць дыстанцыйнага навучання ў іншых краінах пры атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі на тэрыторыі Беларусі:

— У нашай школе разам з засваеннем зместу навучальных праграм праводзіцца выхаваўчая работа, у аснову якой закладзены ідэалагічныя і патрыятычныя складнікі, традыцыі і культура беларускай дзяржавы. Таму для навучэнцаў на тэрыторыі Беларусі абавязковыя для вывучэння такія прадметы, як «Гісторыя Беларусі», «Беларуская мова», «Беларуская літаратура», раздзел «Геаграфія Беларусі». Дыстанцыйныя школы ў іншых дзяржавах не выкладаюць такія прадметы.

Адзначыў Сяргей Клішэвіч і тое, што ў кодэксе ёсць патрабаванне наконт адзення дзелавога стылю, аднак гэта зусім не навацыя, а замацаванне ўжо наяўнай практыкі.

### ЦЭ: ВЫЗВАЛЕННЕ І ПЕРАЗДАЧА

— Шэраг новых пазіцый датычыцца таксама цэнтралізаванага экзамену. Па зваротах бацькоў уведзена норма для вызвалення 11-класнікаў ад ЦЭ па медыцынскіх паказаннях. Гэта дзеці з сур'ёзнымі захворваннямі, якія навучаюцца дома і якія, магчыма, не плануюць атрыманне вышэйшай адукацыі, — для іх гэта права, а не абавязак. Цяпер такая норма дзейнічае толькі ў дачыненні да вучняў дзявятых класаў, — заўважыў дэпутат Палаты прадстаўнікоў. — Яшчэ адно змяненне датычыцца тых, хто атрымаў па ЦЭ нуль балаў. Яны змогуць пераздаць экзамен у жніўні, а не праз год, і атрымаць такім чынам сертыфікат ЦЭ і атэстат. Такая ж норма аб пераздачы ў рэзервовыя дні ці іншыя тэрміны закране і тых, хто не з'явіўся на ЦЭ па ўважлівых прычынах. Але ўсё гэта з 2026 года.

### КАРЫСНАЯ ЗАНЯТАСЦЬ

— Гаворка ідзе пра праграму падрыхтоўкі кіроўцаў. Норма існавала і раней, новаўвядзенні змяненняў кодэкса заключаюцца ў тым, што цяпер яе дзеянне распаўсюджваецца на ўстановы агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі ўсіх пасёлкаў гарадскога тыпу краіны. У такіх населеных пунктах для маладых людзей асабліва актуальная магчымасць і ўменне кіраваць сельскагаспадарчай тэхнікай, механічнымі транспартнымі сродкамі ў цэлым.

З гэтай жа мэтай у кодэкс унесены дапаўненні па прадастаўленні магчымасці засваення навучэнцамі 10-11 класаў спецыялізаваных ліцэяў, сувораўскіх ваенных вучылішчаў, кадэцкіх вучылішчаў, іншых устаноў агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, размешчаных у гарадскім пасёлку, сельскім населеным пункце, адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі кіроўцаў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, — дадаў Сяргей Клішэвіч.

### РАЗМЕРКАВАННЕ І ПЕРАРАЗМЕРКАВАННЕ

— Ураду даюцца паўнамоцтвы на вызначэнне іншых, акрамя прадугледжаных у кодэксе, выпадкаў ажыццяўлення пераразмеркавання, перанакіравання выпускнікоў, маладых спецыялістаў і рабочых, напрыклад, пераразмеркаванне на службу ў сілавыя структуры. Таксама мяняюцца ўмовы, пры якіх пэўныя перыяды залічваюцца ў тэрмін абавязковай работы па размеркаванні або пераразмеркаванні. Так, перыяды ваеннай, альтэрнатыўнай службы, знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім 3-гадовага ўзросту могуць быць залічаны ў тэрмін абавязковай работы па размеркаванні, калі яны будуць прыпадаць на час водпуску, які даецца выпускнікам, або абавязковай работы па размеркаванні, — растлумачыў парламентарый.

### МАЛАДЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ

— Сярод навацый — норма аб тым, што маладым спецыялістам, звольненым у сувязі з прызывам, але не накіраваным для праходжання службы, цяпер дадуць гарантыю на заняцце ранейшай пасады на працягу дзесяці дзён з дня атрымання адпаведнага паведамлення ад ваеннага камісарыята (раней тэрмін быў 5 дзён). Калі прызыўнік захварэе або воінскія часці будуць укамплектаваны, маладога чалавека абавязаны ўзяць назад на работу, адкуль нядаўна звольнілі.

### АДМОВА АД НАКІРАВАННЯ І АДКАЗНАСЦЬ ЗАКАЗЧЫКАЎ КАДРАЎ

— У кодэксе ўстараняецца прабел у рэгуляванні адпаведных адносін, звязаных з працаўладкаваннем выпускнікоў, накіраваных на работу ў адпаведнасці з дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы, калі арганізацыя — заказчык кадраў ліквідуецца, — удакладніў Сяргей Клішэвіч. — Прадугледжваецца, што ад кампенсацыі затрачаных дзяржавай сродкаў у гэтым выпадку выпускнікі вызваляюцца пры немагчымасці прадастаўлення ім новага месца работы шляхам перанакіравання.

Таксама ён растлумачыў пытанні ўзмацнення адказнасці заказчыкаў мэтавай падрыхтоўкі. Так, у кодэксе прадугледжаны абавязак арганізацыі — заказчыка кадраў пакрыць сродкі, затрачаныя дзяржавай на падрыхтоўку спецыяліста, рабочага, служачага, калі ўмовы дагавора будуць неабгрунтавана скасаваны або не выкананы. У цяперашні час такі абавязак прадугледжаны толькі адпаведным дагаворам мэтавай падрыхтоўкі.

### І БАЦЬКІ, І ПЕДРАБОТНІКІ

— З 1 верасня прыёмныя бацькі і бацькі-выхавальнікі афіцыйна атрымаюць статус педагагічных работнікаў. Гэта дазволіць павысіць узровень сацыяльных гарантый для іх, атрымаць аплату за сваю работу і прызнанне дзяржавай значнасці іх дзейнасці. У кожнай вобласці краіны такіх бацькоў некалькі соцень, і падобнае рашэнне стане стымулам для іншых людзей прыняць у сям'ю дзяцей, якія засталіся без апекі.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# ДРАЙВЕРЫ РОСТУ

## Лакаматывам эканомікі выступаюць галіны будаўніцтва, прамысловасці, інфармацыі і сувязі, гандлю

Па выніках чатырох месяцаў дасягнуты паказчыкі вышэй за прагнозныя па інвестыцыях і рэальных даходах насельніцтва, нагадалі ў Мінэканоміцы.

У прыватнасці, тэмп росту ВУП па выніках студзеня—красавіка склаў 102,8 %. Драйверамі выступілі такія галіны, як будаўніцтва (111,4 %), прамысловасць (101,3 %), інфармацыя і сувязь (105,5 %), гандаль (102,6 %).

Так, рознічны тавараабарот за студзень—красавік дадаў 10 %, што абумоўлена апераджальным ростам рэальных даходаў насельніцтва (12 % па выніках студзеня— сакавіка).

Па выніках студзеня—красавіка адбыўся значны прырост інвестыцый у асноўны капітал — плюс 15 %. Прадпрыемствы працягваюць актыўна ўкладваць у сваё тэхналагічнае развіццё і абнаўленне: выдаткі на набыццё машын і абсталявання павялічыліся больш чым на 20 %.

Што датычыцца будаўніцтва, за 4 месяцы ўведзена ў эксплуатацыю 1147 тысяч квадратных метраў жылля, або 112,1 % да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года, што забяспечыла высокія тэмпы ў будаўнічай сферы.

— Гадавая інфляцыя некалькі паскорылася і ў красавіку склала 6,5 %. Гэта звязана з прынятымі рашэннямі па павышэнні рэгуляваных цэн (тарыфаў), а таксама з ростам цэн на некаторыя пазіцыі тавараў, якія пераважна імпартуюцца, — растлумачылі ў Мінэканоміцы.

Тут падкрэслілі, што ўстойлівая работа эканомікі дазваляе забяспечваць высокі ўзровень заработнай платы — больш за 2480 рублёў у студзені—сакавіку 2025 года. Сярэдні памер працоўных пенсій перавысіў 900 рублёў.

АКТУАЛЬНА

# УЛАСНЫЯ МЕТРЫ

## За 4 месяцы 2025-га ў Беларусі ўведзена ў эксплуатацыю больш за 1,1 мільёна «квадратаў» жылля

Паводле звестак Белстата, у студзені—красавіку гэтага года арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 11,1 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 1147 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы жылля.

— Для грамадзян, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 355,9 тысячы «квадратаў» агульнай плошчы, або 31 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля, растлумачылі ў ведамстве.

Тут дадалі, што з агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 215 тысяч квадратных метраў.

Што датычыцца сельскіх населеных пунктаў, тут уведзена ў эксплуатацыю 518,5 тысячы «квадратаў» агульнай плошчы жылля, або 45,2 % ад агульнага ўводу па краіне.




АГРАРНЫ СЕКТАР

# ПАСЕВЫ ПРАЙШЛІ ПРАЗ ВЫПРАБАВАННЕ ХАЛАДАМІ

## Калі вытрымаць тэхналогію, то будзе важкі ўраджай

Як адзначыў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» міністр сельскай гаспадаркі і харчавання ЮРЫЙ ГОРЛАЎ, у сувязі з майскімі замаразкамі пэўныя пашкоджанні пасеваў ёсць. Але спецыялісты гатовыя частку іх перасеяць тымі культурамі, якія дазволяць аграрыям, можа быць, яшчэ ў нейкай ступені атрымаць больш ураджаю, чым планавалі.

«Вялікай катастрофы няма. Гэта звычайная, напэўна, сітуацыя для кліматычных умоў у Беларусі. Так, падобныя гады не кожны год бываюць, але яны здараюцца з пэўнай перыядычнасцю. Аднак вялікай такой, глабальнай небяспекі няма. Гэта звычайная, нармальная работа. Мы гэта разумеем і гатовыя да любых умоў надвор'я», — падкрэсліў Юрый Горлаў.

Асноўны клін збожжавых і зернебабовых культур у нашай краіне практычна пасеяны, паведаміў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Іван КАСКЕВІЧ**. Засталіся грэчка і кукуруза. Калі стабільна ўстановіцца цёплае надвор'е, тады будуць дасейвацца менавіта гэтыя культуры. А цяпер плануецца перасеяць тыя ўчасткі, дзе бяды нарабілі замаразкі. Работнікам аграрнага сектара вызначаны тэрмін — да 1 чэрвеня, практычна за два тыдні трэба перасеяць усе пашкоджаныя ўчасткі.

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання зацвердзіла рабочы план па нарыхтоўцы травяных кармоў. Створаны рэспубліканскі штаб і аператыўныя рабочыя групы. Так, планаваны аб'ём нарыхтоўкі травяных кармоў у сельгасарганізацыях краіны на зімова-стойлавы перыяд 2025/2026 у сукупнасці склаў звыш 10 мільёнаў тон кармавых адзінак, у тым ліку ў планах нарыхтаваць больш за 346 тысяч тон сена, звыш 3,9 мільёна тон сенажу і не менш за 5,79 мільёна тон сіласу.

Па словах Івана Каскевіча, халоднае надвор'е пэўным чынам ударыла і па нарыхтоўцы травяных кармоў. Замаразкі былі не столькі моцныя, колькі паўторныя, што паўплывала і на інтэнсіўнасць адрастання траў. Так, першы ўкос сёлета быў значна слабейшы, чым у звычайныя гады. Таму дзяржава выдзеліла фінансаванне на дадатковыя аб'ёмы азотных угнаенняў. Спецыялісты разлічваюць, што за кошт падкормкі другі ўкос будзе значна лепшым.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. |
| **Продавец** | ОАО «Оранчицкая птицефабрика», Брестская обл., Пружанский р-н, д. Оранчицы, ул. Трудовая, д. 125, УНП 200026018 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |
| **Контактные данные** | **+375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35; E-mail: auction@cpo.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Грузовой самосвал МАЗ 555142 4227 РБ, АЕ5578,** 2006 г. в.
Местонахождение:
Брестская область д. Оранчицы, ул. Трудовая, 125
**Начальная цена с НДС 20 % – 14 000,00 бел. руб.**
(снижена на 25 %)
Шаг аукциона: **5 %** от текущей цены

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % оплата стоимости в течение **14 (четырнадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение 6 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.03.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.05.2025 с 11.00 до 12.00**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.05.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Авиакомпания Гродно»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 02.06.2025.**

**Лот № 1. Планер Ан-2 EW84727**
(Инв. № 0000001175, тип АТ и рег. знак – Ан-2с/х EW-84727, заводской № 1Г20145, 1983 г., установлены: авиационный двигатель АШ-62ИР (Заводской № К1623101, инв. № 0000011072), воздушный винт АВ-2 (Заводской № Н062300480).
Начальная цена с НДС 20 % – 71 813,73 руб.
Задаток – 7 181,37 руб.

**Лот № 2. Планер Ан-2 EW 07428**
(Инв. № 0000001169, тип АТ и рег. знак – Ан-2П EW-07428, заводской №1Г15103, 1973 г., укомплектован: авиационный двигатель АШ-62ИР (Заводской № 16282149, Инв. № 0000001246), воздушный винт АВ-2 (Заводской № W478034).
Начальная цена с НДС 20 % – 59 467,53 руб.
Задаток – 5 946,75 руб.

**Лот № 3. Планер Ан-2 EW33583**
(Инв. № 0000001182, тип АТ и рег. знак – Ан-2с/х EW-33583, заводской № 1Г23020, 1988 г., укомплектован: авиационный двигатель АШ-62ИР (Заводской № К1636488, Инв. № 0000001211), воздушный винт АВ-2 (Заводской № Н048420130).
Начальная цена с НДС 20 % – 71 813,73 руб.
Задаток – 7 181,37 руб.

**Лот № 4. Авиадвигатель АШ-62ИР**
(Инв. № 0000001218, заводской № К16467133, 1987 г.).
Начальная цена с НДС 20 % – 35 107,99 руб.
Задаток – 3 510,80 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–4:** Республика Беларусь, Гродненский р-н, Гродненская обл., Аэропорт.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900 100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **29.06.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182






# І ЗБРОЯЙ, І СЛОВАМ

## У фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца ўнікальная калекцыя рукапісных партызанскіх часопісаў

